**Кароткатэрміновые Беларускіе Настауніцкіе Курсы.** На скліканые на 22-го верасьня кароткатэрміновые настауніцкіе курсы у Вільні запісаліся каля 70 кандыдатау, найбольш быушых вучыцялеу расійскіх народных школ. Па адукацыі найболей кандыдатау скончыушых вучыцельскіе сэмінарыі і сярэдніе школы, але есьць такжа і асобы скончыушые настауніцкіе інстытуты і з вышэйшай адукацыяй.

**Справа беларускіх народных школ**

У справе адкрыцьця беларускіх народных школ, якіе мейсцовымі уласьцямі выключаны з школьнай сеці, у каторую па веска́х увайшлі толькі польскіе школы, Начальнік Школьнага аддзелу Цэнтральнай Беларускай Рады Віленшчыны і Горадзеншчыны, п. М. Каханэвіч, гаварыу з польскім Школьным Інспэктарам Д. Вянцлаускім. П. Вянцлаускі урэшце згодзіуся:

1) Каб настауніні назначаные Школьным Аддзелам Беларускай Рады на мейсцы, былі зацьверджаны польскімі павятовымі інспэктарамі.

2) Каб польскіе павятовые школьные інспэктары рабілі усе ад іх залежнае, што да скліканьня сялянскіх сходау, дзеля прыгавору аб адкрыцьці беларускіх народных школ.